**Самуйлік Я.Р.** (Брэст, Беларусь)

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА Ў ЖЫЦЦЁВЫМ І ТВОРЧЫМ ЛЁСЕ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

Багата зямля беларуская на таленты. Сто дваццаць гадоў таму, на памежжы стагоддзяў, яна нарадзіла Максіма Багдановіча – Паэта, Філосафа, Грамадзяніна, аднаго з апосталаў, волатаў беларускага нацыянальнага адраджэння. І хоць яго жыццё праляцела і згасла, як тая знічка на вечаровым небе, святло ад яе застанецца ў нашых сэрцах на вякі.

Амаль усё сваё свядомае жыццё паэт пражыў па-за межамі сваёй Бацькаўшчыны. З самых ранніх гадоў рускамоўнае асяроддзе акаляла паэта, а расейская культура панавала ў ягонай сям'і. З бацькам, Адамам Ягоравічам, – вядомым беларускім інтэлігентам, этнографам, фалькларыстам і мовазнаўцам – у Максіма былі супярэчлівыя і няпростыя стасункі. Адам Ягоравіч амаль не верыў у адраджэнне беларускага народа, роднай мовы, у беларускую справу. У гэтым праяўляецца нацыянальная трагедыя нашага народа, якога прадумана, свядома пазбаўлялі самасвядомасці, адмаўлялі нашай мове нават называцца моваю, адмаўлялі нацыянальную гісторыю. А як гэта актуальна для нас сёння. Аднак з другога боку, вядома, што Максім спатаіляў сваю інтэлектуальную смагу ў бацькавай бібліятэцы, у якой пераважалі працы па беларусазнаўстве – кнігі Я.Ф. Карскага, І.І. Насовіча, П.В. Шэйна, Е.Р. Раманава і інш. З уласных бацькавых запісаў у сваю чаргу прыходзілі беларускія казкі, а пасля загадкі, прыказкі, песні. Пачуе ён з бацькавых вуснаў і ўрыўкі з твораў Дуніна-Марцінкевіча, Мацея Бурачка. А пазней будуць у Максіма і свае спробы пяра на роднай мове казак і замоў. У Ніжнім Ноўгарадзе, куды пераехала сям'я Багдановічаў з радзімы, знайшлі прыпынішча і сем'і дзвюх бацькавых сясцёр. Максім асабліва любіў прападаць у цёткі Магдалены, дзе ладзіліся беларускія святы: калядьі, дзяды, гуканне вясны, вялікдзень і інш. Памяць юнака занатавала фантастычныя аповеды цётак пра русалак і лесуноў, настальгічныя згадкі пра далёкую і прывабную Беларусь. Хросная цётка з Пінска Вольга Сямёнава, наведаўшы Ніжні Ноўгарад, выпіша Максіму адразу "Нашу долю", а потым і "Нашу ніву". А ў адзін з дзён ліпеня 1907 года пабачыць свет і першы надрукаваны твор паэта, лірычнае апавяданне "Музыка". З гэтага часу яго лёс будзе непарыўна павязаны з роднай Беларуссю, з беларускім нацыянальным адраджэннем. Дыядор Дзябольскі, Максімаў сябра па гімназіі, казаў, што Багдановіч пісаў на мове, якую не чуў вакол сябе, а чуў унутры сябе. Зварот паэта да Беларушчыны і слугаванне ей Дыябор лічыў той загадкай, якая не была разгадана. Загадка, тайна Багдановіча ў яго геніяльным прароцтве, якое актуальнае і ў нашы дні:

Народ, Беларускі Народ!
Ты – цёмны, сляпы, быццам крот.
Табой ўсягды пагарджалі,
Цябе не пушчалі з ярма
І душу тваю абакралі, –
У ёй нават мовы няма.
Збудзіўшысь ад грознай бяды,
Ўвесь поўны смяротнай жуды,
Ты крыкнуць не вольны "Ратуйце!"
І мусіш ты "Дзякуй!" крычаць.
Пачуйце жа гэта, пачуйце,
Хто ўмее з вас сэрцам чуваць!

Гэты верш пераклікаецца з творамі іншых нашых класікаў: з вершам Янкі Купалы “А хто там ідзе?” (з фразай *“людзьмі звацца”),* з афарызмам Ігната Абдзіраловіча з ягонага філасофскага трактата “Адвечным шляхам” *(Людзі не разумеюць, што разам з беларускасцю яны губляюць частку чалавечнаці”),* з апавяданнем Змітрака Бядулі “На Каляды к сыну” (сын выракаецца маці, засаромеўшыся яе “вясковай” мовы і свайго простага паходжання: *“Я цябе... не знаю...”),* з апавяданнем Вацлава Ластоўскага “Прывід” *(забыўся ты людское назовы сваёй і гэтым сцёр ты з твару свайго знамя людское).* Страта ідэнтычнасці асэнсоўваецца Максімам Багдановічам і іншымі выбітнымі песнярамі Беларусі як своеасаблівая страта “людскасці”: нездарма словы “маці” і “радзіма” ў іх творчасці заўсюды атаясамліваюцца.

Болем за любімую Беларусь, за “родную Маці-Краіну” прасякнуты верш Максіма Багдановіча “Пагоня”. У гэтым творы паэт звяртаецца да сівой мінуўшчыны, да вялікай і слаўнай гісторыі нашых прашчураў, якая яго ратавала ў асабліва цяжкія часіны:

Толькі ў сэрцы трывожным пачую
За краіну радзімую жах, –
Ўспомню Вострую Браму святую
І ваякаў на грозных канях.

І ўжо як быццам перад намі наяве, на момант займаючы дыханне ў нашых грудзях, чуецца тупат капытоў, цоканне падкоў:

Ў белай пене праносяцца коні, –
Рвуцца, мкнуцца і цяжка хрыпяць…

Далей катэгарычна сцвярджаецца, што Беларусь была, ёсць і будзе незалежнай дзяржавай са сваёй мовай, культурай, шанаванай нацыянальнай гісторыяй:

Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разбіць, не спыніць, не стрымаць.

Гэта наша этнічная Літва, якая яшчэ вядома пад назваю Чорная Русь, народжаная на Навагародскай зямлі. Пазней нашы заходнія суседзі – жмудзь і аўкштайты – продкі сучасных літоўцаў – скарысталі гэты назоў для сваёй краіны Летувы. А таксама зрабілі сталіцай сваёй дзяржавы Вільню, спрадвечны беларускі горад.

А вершнікі паўз нас ляцяць з сівой мінуўшчыны ў будучыню. І зноў жа ёсць у гэтым нейкая таямніца:

У бязмерную даль вы ляціце,
А за вамі, прад вамі – гады.
Вы за кім у пагоню спяшыце?
Дзе шляхі вашы йдуць і куды?

І міжволі ўзнікаюць пытанні: чаму, мы, беларусы, гаворачы словамі бессмяротнага Янкі Купалы, ужо амаль страцілі сваю “спадчыну” і чаму яны, продкі, змаглі абараніць і захаваць яе?

І тут жа, на наш погляд, гучыць адказ на нашыя пытанні:

Мо яны, Беларусь, панясліся
За тваімі дзяцьмі уздагон,
Што забылі цябе, адракліся,
Прадалі і аддалі ў палон?

Геніяльны Максім Багдановіч як бы свярджае: “Самы страшны наш вораг – гэта мы самі, культурная аморфнасць і моўны нігілізм беларусаў, абыякавасць нашага народа да свае мовы, культуры, нацыянальнай гісторыі.” І не трэба шукаць ворагаў на захадзе ці ўсходзе, якія, і гэта праўда, рабавалі, знішчалі, забівалі беларусаў. Чаго толькі вартая т.зв. “невядомая вайна” 1654–1667 гг. паміж Рэччу Паспалітай і Расіяй, калі насельніцтва Беларусі скарацілася напалову: кожны другі жыхар загінуў або трапіў у палон ці быў выселены на ўсход. Ці апошняя вайна з Нямеччынай, калі быў знішчаны, спалены жыўцом або прапаў, згінуў на катаржных работах, у канцлагеры кожны трэці беларус.

А самае страшнае, супроць чаго і змагаюцца воі Пагоні, – гэта здрада беларускай справе, беларушчыне. Максім Багдановіч просіць іх скіраваць свае духоўныя мячы нашай слаўнай і неўміручай гісторыі, нашай сівой мінуўшчыны супроць тых, хто не верыць у свой народ, хто ўжо амаль выракся сваёй мовы, мовы роднай маці:

Біце ў сэрцы іх – біце мячамі,
Не давайце чужынцамі быць!
Хай пачуюць, як сэрца начамі
Аб радзімай старонцы баліць…

Далей паэт прамаўляе як малітву:

Маці родная, Маці-Краіна!
Не усцішыцца гэтакі боль…
Ты прабач, Ты прымі свайго сына,
За Цябе яму ўмерці дазволь!..

Сын свайго шматпакутнага народа ўсім сваім гарачым сэрцам далучаецца да Пагоні і ўмольна просіць нас таксама знайсці сваё месца сярод магутных і непераможных вершнікаў:

Ўсё лятуць і лятуць тыя коні,
Срэбнай збруяй далёка грымяць…
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разбіць, не спыніць, не стрымаць.

Яны, вершнікі, імчацца з сівой мінуўшчыны на дапамогу нам, беларусам, каб мы зноў змаглі адчуць сябе сваімі ў вялікай еўрапейскай сям’і народаў, дзе ў нашай магутнай сярэдневечнай дзяржаве – Вялікім Княстве Літоўскім – наша мова, старабеларуская мова, была дзяржаўнай. На ёй ўпершыню ў гісторыі ўсходніх славян у XVI ст. з’явіліся друкаваныя кнігі, а таксама першая ў Еўропе Канстытуцыя – Статут ВКЛ.

Калі б Максім Багдановіч напісаў толькі адзін гэты верш, то гэтага было б даволі на яго хуткаплыннае жыццё, на прызнанне ў ім Генія Беларускай

Паэзіі, Беларускага Духу, Беларускасці. Верш з'явіўся вельмі своечасова, калі ў чарговы ўжо раз нашу радзіму рвалі, шкуматалі на кавалкі прагныя імперыялістычныя драпежнікі. Гэты верш паэта можна назваць вершам-змаганнем, вершам-звонам, вершам-гімнам беларусаў XX стагоддзя. Але найперш яго трэба назваць вершам-малітвай, якой маліліся тысячы беларусаў на Салаўках, у Картуз-Бярозах, у Асвенцімах, у Курапатах…

Максім Багдановіч валодаў майстэрствам абагаўляць звычайныя словы, укладваць у іх першаісны біблейскі сэнс:

Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі,
Над хвалямі сінеючага Ніла,
Ўжо колькі тысяч год стаіць магіла:
Ў гаршку насення жменю там знайшлі.

Хочацца верыць, што ў XXI стагоддзі збудуцца прарочыя словы паэта, наш народ абудзіцца ад векавечнага сну, разняволяцца яго творчыя памкненні:

Хоць зернейкі засохшымі былі,
Усё ж такі жыццёвая іх сіла
Збудзілася і буйна ўскаласіла
Парой вясенняй збожжа на раллі.

Вось сімвал твой, забыты краю родны!
Зварушаны нарэшце дух народны,
Я веру, бясплодна не засне,
А ўперад рынецца, маўляў крыніца,
Каторая магутна, гучна мкне,
Здалеўшы з глебы на прастор прабіцца.

Гэта запавет, пасланне, нам, яго нашчадкам, прысвяціць сваё жыццё святой справе адраджэння роднага краю. Свой крыж на Галгофу Максім Багдановіч узнёс у 25 год, не дажыўшы нават да ўзросту Хрыста, услед за сваімі папярэднікамі Кастусём Каліноўскім, Францішкам Багушэвічам… Зернейка, сеянае ім і ягонымі аднадумцамі ў духоўную глебу, *"збудзілася і буйна ўскаласіла"* ў 20-30 гады мінулага стагоддзя, калі ў беларускую культуру прыйшлі сотні і сотні паэтаў, пісьменнікаў, артыстаў, мастакоў, вучоных, настаўнікаў. І нішто не перашкодзіла ім: ні сталінскія рэпрэсіі, ні здрада пэўнай часткі інтэлігенцыі беларускай справе. Пазней яно, гэтае зернейка, прарасло Уладзімірам Караткевічам, Васілём Быкавым, Рыгорам Барадуліным, Нілам Гілевічам, Генадзем Бураўкіным, Анатолем Вярцінскім, Уладзімірам Арловым, Уладзімірам Някляевым…

На вялікі жаль, духоўнага адраджэння нашага народа, яго мовы і культуры, нягледзячы на тытанічныя намаганні Максіма Багдановіча, яго папярэднікаў і паслядоўнікаў, пакуль не адбылося. Аднак мы заўсёды будзем помніць яго прарочыя радкі:

Беларусь, твой народ чакаецца
Залацістага, яснага дня…

І яшчэ. Паэт вельмі непакоіўся, да чаго можа прывесці раз'яднанасць беларусаў у будучыні (як гэта актуальна для сённяшняй Беларусі), таму і папярэджваў:

Нашто ж на зямлі
Сваркі і звадкі, боль і горыч,
Калі мы ўсе разам ляцім
Да зор?